ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 36 (208) | Панядзелак, 9 снежня 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

**З 4 па 7 снежня 1974 года Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў знаходзіўся ў Францыі з рабочым візітам па запрашэнню Прэзідэнта Французскай Рэспублікі В. Жыскар д'Эстэна. У ходзе праведзеных перагавораў вырашана шэраг важных пытанняў, аб чым сведчыць савецка-французскае камюніке.**

**Савецкія людзі з адабрэннем сустрэлі вынікі візіту таварыша Л. І. Брэжнева ў Французскую Рэспубліку.**

## СЕСІЯ—ЭКЗАМЕНАТАР СТРОГІ

Пабудзьце сёння ў студэнцкім асяроддзі і абавязкова адчуеце ўсё ўзрастаючую заклапочанасць аб надыходзячай зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі. У пэўнай меры яна хвалюе і тых, для каго будзе першай у жыцці, і тых, для каго з'явіцца перадапошнім рубяжом на шляху да дыплома аб вышэйшай адукацыі.

Сесія падсумуе поспехі і пралікі ўсяго семестра. А для таго, каб яна прынесла больш радасці, чым горычы, патрэбна сістэматычная і грунтоўная падрыхтоўка да яе. І не толькі студэнтаў. Шмат трэба папрацаваць прафесарска-выкладчыцкаму саставу. Узровень паспяховасці ахарактарызуе якасць работы кожнага прадметніка, калі жадаеце, нават лабаранта. А калі гаварыць у цэлым, па выніках сесіі можна будзе меркаваць аб каэфіцыенце карыснага дзеяння кафедр, дэканатаў, партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый.

Карацей кажучы, сесія строгі экзаменатар у самым шырокім сэнсе слова.

Як жа ідзе падрыхтоўка да гэтага адказнага выпрабавання ў жыцці кожнага студэнта?

Перш за ўсё трэба сказаць пра аб'ектыўныя цяжкасці. Яны выкліканы ўшчыльненнем заняткаў, каб навярстаць час, затрачаны на сельскагаспадарчых работах. Студэнты загружаны цяпер максімальна. Ды інакш і нельга. Малейшая паслабленасць можа адмоўна адбіцца на выніках сесіі.

На жаль, гэту ісціну зразумелі яшчэ не ўсе студэнты. Многія з іх разлічваюць на «штурмаўшчыну» у дні сесіі. Маўляў, не дасплю, але як-небудзь асілю экзамены.

Скажам прама: хто выбраў такі метад, можа пралічыцца.

Не можа не выклікаць трывогі тая акалічнасць, што вельмі многія студэнты без уважлівых прычын прапускаюць заняткі. Чэмпіён па гэтаму не зайздроснаму паказчыку — факультэт фізічнага выхавання, дзе па стану на 1-ае снежня студэнтамі прапушчана 6143 гадзіны. А калі ўлічыць, што 8905 гадзін прапушчана яшчэ па ўважлівых (варта было б дэталёва разабрацца, якія яны) прычынах, дык атрымоўваецца, што амаль кожны восьмы студэнт факультэта ў першым семестры не наведваў лекцый і практычных заняткаў.

Сумная статыстыка і на геалагічным факультэце, дзе ўжо ў працэсе вучобы многія студэнты імкнуцца даказаць, што выбралі для сябе рамантычную прафесію і наведваюць заняткі ў залежнасці ад настрою.

У цэлым па ўніверсітэту за першы семестр студэнтамі прапушчана ўжо больш 36 тысяч вучэбных гадзін. Калі рабіць аналагічнае параўнанне, дык атрымоўваецца, што 170 (!) студэнтаў зусім не хадзілі на заняткі.

Мірыцца з такім становішчам нельга ні ў якім разе. Тым больш, што не ўсе пропускі па дабраце старааст адзначаюцца ў журналах.

Варта браць прыклад з эканамічнага факультэта. Супраць прагульшчыкаў тут вядуць рашучы бой. Іх прозвішчы рэгулярна можна ўбачыць у насценных газетах, у «маланках». Дэканат прымае да прагульшчыкаў строгія меры адміністрацыйнага ўздзеяння. А таму колькасць пропускаў без уважлівых прычын на гэтым факультэце ў разліку на аднаго студэнта ў 2—3 разы меншыя, чым на іншых. І як канчатковы вынік, тут маюць адзін з лепшых вынікаў па бягучай паспяховасці.

Аб узроўні падрыхтоўкі студэнтаў да сесіі могуць сведчыць адзнакі, атрыманыя па кантрольных работах, на калёквіумах, семінарскіх занятках і г. д. На жаль, бягучая паспяховасць студэнтаў жадае быць намнога лепшай. Напрыклад, на геалагічным факультэце яна складае ўсяго 81,3 працэнта. Менавіта ў гэтым паказчыку і адлюстроўваюцца ў пэўнай ступені вынікі пропуску заняткаў.

Дзейсным сродкам кантролю за падрыхтоўкай студэнтаў з'яўляюцца экраны бягучай паспяховасці. Аднак на большасці факультэтаў яны запаўняюцца несвоечасова. У гэтым вінаватыя многія выкладчыкі, якія марудзяць з праверкай кантрольных работ, дачай справаздачы аб выстаўленых адзнаках.

Да сесіі засталося ўжо менш месяца. У падрыхтоўцы да яе трэба як мага хутчэй ліквідаваць усе прабелы. Прадстаячыя залікі і экзамены павінны ўстурбаваць не толькі ўсіх, да адзінага, студэнтаў, але і кафедры, дэканаты, вучэбна-выхаваўчыя камісіі і г. д. Кожны выкладчык павінен адчуваць, хто са студэнтаў не выклікае надзеі і на экзаменах можа «праваліцца». Для такіх трэба арганізаваць усемагчымую дапамогу.

Будзе вельмі карысным, калі ва ўніверсітэце атрымае шырокае распаўсюджванне пачынанне студэнтаў гістарычнага аддзялення групы Г-42, якія ўзялі шэфства над першакурснікамі і дамагаюцца таго, каб кожны з іх добра падрыхтаваўся і паспяхова вытрымаў першую ў сваім жыцці сесію.

Хочацца верыць, што студэнты нашага ўніверсітэта ў дні, якія засталіся да пачатку сесіі, папрацуюць з поўнай нагрузкай, абагацяць сваю памяць неабходнымі ведамі і на заліках і экзаменах парадуюць сваімі адказамі.



**НА ЗДЫМКУ: чацвёртакурснікі фізічнага факультэта Г. Пакаташкін і М. Варушчанка — пераможцы ўніверсітэцкай выстаўкі доследна-канструктарскіх, тэхнічных і мастацка-прыкладных работ.**

## «САЮЗ-16» У ПАЛЁЦЕ

ЦЭНТР КІРАВАННЯ ПАЛЁТАМ, 7. (ТАСС). Палёт касмічнага карабля «Саюз-16» працягваецца. Да 12 гадзін па маскоўскаму часу карабель зрабіў 81 абарот вакол Зямлі.

У ходзе палёту касманаўты А. В. Філіпчанка і М. М. Рукавішнікаў працягвалі выпрабаванні аўтаматычнай сістэмы і асобных вузлоў стыковачнага агрэгата, праводзілі біялагічныя эксперыменты.

На 68 і 69 вітках фатаграфавалася панарама дзённага гарызонта ў палярызаваным святле на трасе даўжынёй каля 30 тысяч кіламетраў. З мэтай праверкі ва ўмовах рэальнага касмічнага палёту асноўных элементаў абсталявання для запланаванага ў будучым сумесным палёце эксперыменту «штучнае сонечнае зацьменне» касманаўты фатаграфавалі выбраны ўчастак зорнага неба.

Экіпаж карабля пачаў падрыхтоўку да спуску на Зямлю. Праводзяцца праверкі сістэм кіравання, энергасілкавання, рухальнай устаноўкі, падрыхтоўваюцца да вяртання матэрыялы навуковых даследаванняў. У адпаведнасці з праграмай палёту ціск у адсеках узняты да 760 міліметраў ртутнага слупа.

Усе сістэмы карабля працуюць нармальна. Стан здароўя і самаадчуванне А. В. Філіпчанкі і М. М. Рукавішнікава добрыя. Палёт працягваецца.

## СЕМІНАР ПАРТАКТЫВУ

Партком універсітэта правёў семінар сакратароў, намеснікаў сакратароў партарганізацый і партгрупоргаў. Перад імі з лекцыяй «XXIV з'езд КПСС аб узрастанні ролі партыі ў камуністычным будаўніцтве» выступіў намеснік сакратара партыйнага камітэта А. Я. Семянчук.

На семінары падведзены вынікі справаздач і выбараў у партгрупах, партыйных арганізацыях універсітэта, разгледжаны пытанні аб планаванні работы на 1975 год, вучобе камуністаў у сістэме партыйнай асветы, павышэнні ролі куратараў у вучэбна-выхаваўчай рабоце. Па гэтых пытаннях выступілі сакратар парткома У. В. Казлоў, намеснік сакратара парткома В. В. Серыкаў, член парткома І. Ф. Харламаў.

## СТАЛІ АСПІРАНТАМІ

На эканамічным факультэце добра вядома імя Валерыя Трухава. Ён вызначыўся выдатнай вучобай, плённай навукова-даследчай работай. Яго пяру належыць некалькі каштоўных, маючых практычнае прымяненне, даследаванняў, якія атрымалі высокую адзнаку на рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах студэнцкіх навуковых прац. Таму не выпадкова пры размеркаванні выпускнікоў Валерыю было прапанавана сёлета паступіць у аспірантуру, і ён з задавальненнем згадзіўся працягваць вучобу далей. Нядаўна ім паспяхова здадзены ўступныя экзамены, пасля чаго залічаны ў аспірантуру пры кафедры эканомікі працы ГДУ.

У ліку лепшых студэнтаў факультэта фізічнага выхавання быў Уладзіслаў Баркоў, механіка-матэматычнага факультэта — Валянціна Сахарнікава, якія таксама актыўна ўдзельнічалі ў рабоце студэнцкага навуковага таварыства. І яны працягваюць зараз вучобу ў аспірантуры ўніверсітэта.

У новым навучальным годзе, які пачаўся са снежня, колькасць аспірантаў ГДУ павялічылася на 19 чалавек, сярод якіх у асноўным былыя выпускнікі ўніверсітэта. А выдатнікі вучобы В. Наважылаў, У. Шолах, У. Семянчук, Д. Курыленка, атрымаўшы дыпломы аб вышэйшай адукацыі, пакінуты на працу ва ўніверсітэце ў якасці выкладчыкаў-стажораў.

Шэсць сваіх лепшых выпускнікоў, сярод якіх У. Багамольнікаў, М. Старавойтаў і іншыя, універсітэт сёлета накіраваў на вучобу ў мэтавыя аспірантуры пры інстытутах Акадэміі навук БССР.

## НА РАБФАК ЗАЛІЧАНЫ ЛЕПШЫЯ

**Дзесяць дзён працавала камісія па прыёму слухачоў на падрыхтоўчае аддзяленне ўніверсітэта. Перад ёй прайшло каля 400 маладых рабочых, калгаснікаў, звольненых у запас воінаў Савецкай Арміі. Іх рэкамендавалі на вучобу калгасы і саўгасы, прадпрыемствы, будаўнічыя і іншыя арганізацыі, воінскія часці.**

**Пасля субяседавання камісія рэкамендавала ў састаў слухачоў самых падрыхтаваных і дастойных.**

**У мінулы панядзелак на падрыхтоўчым факультэце пачаліся заняткі.**





**На здымку: субяседаванне праходзіць былы воін, камсамольскі актывіст Васіль Браім з вёскі Ляскавічы Калінкавіцкага раёна. Думка членаў камісіі была адзінай — залічыць. Пасля вучобы на падрыхтоўчым аддзяленні Васіль стане студэнтам эканамічнага факультэта.**

Фота А. Рудчанкі.

# ВІТАЕ ДЗЕНЬ, ШТО СОНЦАМ СВЕЦІЦЬ

**Сёння мы вас знаёмім з пяцікурснікам гісторыка-філалагічнага факультэта Святаславам Крупенькам. Хутка ён скажа: «Бывай універсітэт! Мне цябе не забыць!».**

**Прыехаў Слава з Прыдзвіння, з Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Тут ва ўніверсітэце, далёка ад роднага азёрнага краю, пранікся яшчэ большай любоўю да незабываемых мясцін шчаслівага дзяцінства. І на паперу**



**кладуцца паэтычныя радкі светлых думак і пачуццяў.**

**З першых дзён С. Крупенька прымае актыўны ўдзел у рабоце ўніверсітэцкага літаб'яднання. Сябры ведаюць яго не толькі як здольнага пачынаючага аўтара, а і як добрага арганізатара карысных спраў, аднаго з лепшых спартсменаў факультэта.**

**Святаслаў Крупенька — сціплы, просты і ў той жа час жыццярадасны чалавек. У адным з вершаў ён піша «Вітаю дзень, што сонцам свеціць...»**

## ВІТАЮ

Вітаю дзень, прасцяг шырокі,
Блакіт бяздонны па-над краем!
Які імклівы час і стромкі
Іскрыцца прамяністым маем!
Вясна! Цябе не прамяняю
Я ні на што, бо гэта сіла,
З якою мы жыццё вітаем,
На моц прабуем нашы крылы.
Нам будаваць, узводзіць, сеяць
Прыходзіць час з вясной бурлівай.
Вітаю дзень, што сонцам свеціць,
Вітаю гэты міг шчаслівы.

*Старонка літаратурнага аб'яднання*




**Аляксандр КРАЧКОЎСКІ,**
**студэнт-завочнік.**
**(З салдацкага сшытка).**

## В ПОХОД

А у нас холода — не беда, не беда,
И без нас убегают домой поезда.
А морзянки трезвон снится нам по ночам.
Автоматы прижали мы крепче, чем мам.
И маторы машин снова песни поют,
Значит снова в поход нас дороги зовут.

□

**Любоў АДАМЕНКА,**
**студэнтка-завочніца.**

* * *

Хочешь — приду. Ещё раз позови.
И неотчаянным ветром ворвусь —
Тихой снежинкой с немой высоты
Я на ладони твои опущусь.
Ты передашь мне так много тепла
И убедишься — оттаяла я.

□

**Генадзь ЛАПАЦІН**

* * *

Там, где сад начинается спелый
и кончается серый вокзал,
кто-то надпись из камешков сделал,
кто-то счастья в пути пожелал.
Я впервые дорогою этой
уходил от томящих забот,
уходил от домашнего света,
уходил в неизвестность, вперёд.
Говорят, неизвестность — удачи,
неизвестность — надежд полон рот...
У меня всё сегодня иначе:
незнакомость сомненья даёт.
И до стука колёс сердце млело
и гуляла сухость во рту,
но в начале пути кто-то сделал,
незнакомый мне, доброту.

**Алесь ЛОЗКА**

## РАНАК

Сонца летняе ўзышло,
І раса бурштынам стала,
Бусы, поўныя святлом,
Цёплым промнем падзяўбала.
А мясцовы ўстаў артыст —
Барытон свой правярае.
На зямлю кляновы ліст
Парашуцікам злятае.
Пазяхнуў дзесь «жуpавель»,
Намачыўшы ў студні дзюбу.
Ходзіць конік па траве
Ў тумановай белай шубе.
Кашлянулі трактары
Па-старэчы, ёмка
І пайшлі па два, па тры
Са стальной рыдлёўкай.
Працавітая пчала
Зазызыкала на трутняў,
Збор мядовы пачала,
Збор нялёгкі, трудны.
Сонца летняе ўзышло,
Патушыла зоркі.
Прачынаецца сяло,
Нівы, лес, пагоркі...

**Анатоль ЗЭКАЎ**

* * *

Як цяжка, калі даверам
Цябе не атуляць, паверце!
І млосна, калі на паперы
Радкі не ад самага сэрца.
Як цяжка, калі аднойчы
назвалі цябе эгаістам,
хоць праўдзе глядзеў ты ў вочы,
не слаўся абвялым лістам.

**Ірына БАГДАНОВІЧ**

## УКРАДИ МЕНЯ

Поётся в доброй старой песне,
Что было так в летах былых:
Украл жених себе невесту
И укатил на вороных.
Невеста плакала сначала
И долю горькую кляла,
И всё по матушке скучала,
И всё подруг во сне звала.
Но раз украдкой поглядела
На похитителя она...
И сердце радостно запело,
И расцвела в душе весна.
Я ей завидую немножко.
Хочу: пускай средь бела дня,
Что б ты однажды влез в окошко
И насовсем украл меня.
И что б увёз как будто силой,
Погоню бросив позади!
О, я прошу тебя, мой милый,
Быстрей меня ты укради!



**Першы снег.**

Фота **В. Афанасенкі, студэнта геалагічнага факультэта.**

**Уладзімір СУСОЛКІН**

* * *

Гудят машины меж столетних пихт.
Такого шума не было здесь сроду —
От взрывов зверь встревоженный бежит
Упрятаться в уютную берлогу.
Крошатся скалы, рушится тайга...
Мы приручаем дикую природу,
Ведь скоро здесь промчатся поезда
Через Байкал-Амурскую дорогу.

**СТУДЭНТЫ — ШКОЛЬНІКАМ**

# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, ПАЭЗІЯ!

...Магутнае слова. Цудадзейная наша родная маці-мова.

Колькі пра цябе ўжо сказана, а колькі мы яшчэ пачуем добрага ад тваіх удзячных сыноў і дачок!

Хвала таму, хто цябе шануе і любіць, а яшчэ лепш, хто развівае і нясе ў гушчыню народа твае лепшыя здабыткі.

З якой улюбёнасцю і цікавасцю чытаюць і слухаюць школьнікі неўміручыя творы лепшых прадстаўнікоў народа.

Так, вялікая сіла нашай роднай мовы.

Наша задача, задача настаўніка — данесці яе да сэрцаў падрастаючага пакалення.

З якой увагаю і замілаванасцю слухаюць цябе вучні, калі ты чытаеш у вольную хвіліну вершы, і, асабліва, тады, калі яны асабістыя. З такой жа цікавасцю пасля гэтага яны слухаюць і тлумачэнні новага матэрыялу.

Трэба шукаць і развіваць нераскрытыя таленты сваіх выхаванцаў. Старэйшыя класы — гэта такі ўзрост, калі амаль кожны спрабуе сваё паэтычнае пяро, шукае сродкаў для выражэння думак і пачуццяў. І важна ў такі час падтрымаць, узрасціць першыя ўсходы смелых пачынанняў.

Літаратурны гурток, створаны мною ў СШ № 19 г. Гомеля, думаецца, у многім дапаможа будучым літаратарам, аматарам мастацкага слова. Гурток ставіць сваёй мэтай развіццё майстэрства найбольш здольных і таленавітых вучняў у напісанні вершаў, сачыненняў-апавяданняў, газетных карэспандэнцый.

Нядаўна гурток запрасіў да сябе ў госці нас, членаў універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Крыніца». Перад гэтым была наладжана невялікая выстаўка надрукаваных твораў пачаткоўцаў у перыядычных выданнях. Гэтае завочнае знаёмства ў многім зацікавіла і прадвызначыла поспех сустрэчы.

Свае вершы прачыталі студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта — маладыя паэты Анатоль Зэкаў, Аляксандр Дуброўскі, Ніна Пінчук, Святаслаў Крупенька, Міхась Камароўскі і аўтар гэтых радкоў.

Прысутныя вучні (сямікласнікі і васьмікласнікі) даведаліся аб рабоце ўніверсітэцкага літаб'яднання, аб паэтах, якія некалі вучыліся ў нашай ВНУ і паэтах Гомельшчыны.

Цікавым было выступленне пачынаючай паэтэсы, члена школьнага літаратурнага гуртка васьмікласніцы Людмілы Барбаковай. Яе вершы вызначаюцца лірычнасцю, імкненнем выказаць свае пачуцці сродкамі паэтычнага слова.

**А. ЛОЗКА,**
**кіраўнік школьнага літгуртка, студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Апавяданне*

# МАНЬКА

Дзед Якім прадаў сваю казу Маньку і занядужаў.

Ён даўно ўжо адзін жыў у старэнькай хаце. Баба Наста памерла гадоў восем назад. Дзетак ім бог не даў, але пражылі яны ціха, дружна. Стары Якім памятае, што як пахаваў Насту, вось гэтак жа ляжаў дні са тры. Думаў, ужо не здолее падняцца. Але, слава богу, абыйшлося.

У той жа год і купіў сабе казу. Ды і купіў толькі таму, што старая, бывала, часта прасіла:

— Слухай, Якімка, а можа возьмем сабе казу? І малако сваё, і нам весялей будзе.

Якім упіраўся:

— І чаго ты прычапілася да гэтае казы? Я гэтага духу казлінага не магу пераносіць. А ты мне малако...

А цяпер ляжыць дзед у пустой хаце зусім адзін, хворы, і разважае сам сабе:

— І навошта гэта я дурань стары прадаў Маньку. Каб Наста была жыва, яна б да гэтага не дапусцілася. Трэба забраць яе назад, толькі ж тры дні прайшло. Ды ці выберуся я ў тое Залунеўе? Можа ёй там будзе і няблага? Ат, чаго там казаць? Хіба будуць яе так дагдядаць, песціць, як я. Ніхто і слова ласкавага не скажа. А што як, барані бог, біць будуць?

Зрэшты, чаго я расквахтаўся: памру ж... Можа паразімаваў бы яшчэ і гэтую зіму. І Манька была б дома. Старшыня і сена абяцаў. Ды і ў агародзе вунь качанне якое павыпірала, люба глянуць.

Няхай сабе як хочуць, а Маньку я забяру. Пасля такіх думак дзед Якім павесялеў і адразу адчуў сябе лепей.

Пакрэктваючы, падняўся з ложка, падышоў да акенца і тут аж прысеў ад здзіўлення — на агародзе каля качання ласавалася Манька. Стары, як толькі мог, хуценька выйшаў у двор, хацеў прыкрыкнуць: «Што гэта ты, нягодніца, робіш?» Але з грудзей замест гэтага вырваўся ні на што не падобны хрып. А «нягодніца» падбегла да гаспадара, уткнулася галавою ў яго калені і жалобна забляяла.

Стары Якім дрыжачымі рукамі развязаў у яе на шыі чужы ланцужок і прагаварыў:

— Нічога, дурненькая, нічога. Мы з табой яшчэ перазімуем.

Дзве старэчыя слязінкі, як бы саромеючыся, ціхенька сплылі па зрэзаным маршчынамі твары і схаваліся ў сівой барадзе.

Таня КУНДАС,
**студэнтка-завочніца.**

# НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

5-е снежня для дацэнта кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі Мікалая Кандратавіча Бабкова дзень асаблівы. Разам з усімі савецкімі людзьмі ён святкуе Дзень Канстытуцыі СССР і адзначае свой дзень нараджэння. А сёлета супрацоўнікі кафедры геалагічнага факультэта шчыра павіншавалі яго з юбілеем. Мікалаю Кандратавічу споўнілася 60 гадоў.

М. К. Бабкоў нарадзіўся ў беднай сялянскай сям'і ў вёсцы Хальч Веткаўскага раёна. Яго працоўная біяграфія пачалася з дзіцячага ўзросту. За гады свайго жыцця Мікалай Кандратавіч прайшоў даволі складаны шлях ад звычайнага сялянскага хлопца да кандыдата сельскагаспадарчых навук, імя якога цяпер добра вядома ва ўсёй рэспубліцы як спецыяліста ў галіне глебазнаўства.

Аднавяскоўцы з ўдзячнасцю і цяпер успамінаюць свайго земляка. Яшчэ будучы вучнем Веткаўскай школы, М. К. Бабкоў актыўна ўдзельнічаў у навучанні непісьменных сялян. У перыяд калектывізацыі Мікалай Кандратавіч, нягледзячы на юнацкі ўзрост, з вялікім жаданнем дапамагаў пераводзіць вёску на сацыялістычны лад.

Першы крок да навукі М. К. Бабкоў зрабіў праз рабфак, пасля заканчэння якога пэўны час працаваў на радзіме ў сельскім Савеце.

У маладыя гады Мікалаю Кандратавічу давялося павучыцца на падрыхтоўчых курсах у інстытут, папрацаваць на адным з гомельскіх заводаў, дзе ён стаў



ударнікам. Прага да ведаў прывяла яго ў лесатэхнічны інстытут, які з поспехам закончыў у 1939 годзе. Ужо ў студэнцкія гады актыўна ўдзельнічаў у разнастайных экспедыцыях, навукова-даследчай рабоце, звязанай з вывучэннем воднага рэжыму глеб і грунтоў Беларусі.

Пасля службы ў арміі М. К. Бабкоў доўгі час працаваў у Беларускім навукова-даследчым інстытуце лясной гаспадаркі, дзе працягваў займацца распрацоўкай праблем глебазнаўства пад кіраўніцтвам акадэміка П. П. Рагавога. Як адзін са здольных супрацоўнікаў Мікалай Кандратавіч быў накіраваны на вучобу ў аспірантуру. Пасля яе заканчэння паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонага звання кандыдата сельскагаспадарчых навук.

Значны час М. К. Бабкоў працаваў у Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце, дзе на працягу трох гадоў загадваў кафедрай глебазнаўства і аграноміі.

З 1965 года Мікалай Кандратавіч працуе ў нашай ВНУ. За гэты час ён зарэкамендаваў сябе чулым і добрым педагогам, удумлівым вучоным. Ім напісана каля дваццаці навуковых прац, якія маюць важнае практычнае значэнне.

М. К. Бабкоў вядомы шырокай грамадскасці як актыўны член таварыства «Веды», дзе на працягу дваццаці гадоў быў старшынёй метадычнага Савета.

На геалагічным факультэце выкладчыкі і студэнты адносяцца да Мікалая Кандратавіча з вялікай павагай, якую ён заслужыў усёй сваёй добрасумленнай працай на карысць нашай Радзімы. І хоць за плячыма ўжо 60, але гэты чалавек яшчэ мае гарачае жаданне і сілы, каб працягваць працу па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі. І мы жадаем яму здароўя яшчэ на многа гадоў жыцця.

**М. ЧЫЧЫН,**
**дацэнт кафедры агульнай геалогіі;**
**А. АКУЛЕВІЧ,**
**В. ХАЙНАК,**
**выкладчыкі кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі.**



**Цікавая сустрэча адбылася ў студэнтаў трэцяга курса біёлага-глебавага факультэта з вядомым мастаком Гомеля Аляксандрам Канстанцінавічам Мельянцам — былым народным мсціўцам Лельчыцкай партызанскай брыгады. Госць падзяліўся ўспамінамі аб барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, аб тым, як яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў сваіх малюнках адлюстроўваў мужнасць савецкага народа і церпячых крах гітлераўскіх фашыстаў.**

**Удзельнікі сустрэчы падрабязна даведаліся пра пасляваенную творчасць мастака, яго работы, створаныя ў апошні час.**

**На здымку: мастак А. К. Мельянец (злева) сярод студэнтаў біёлага-глебавага факультэта.**

Фота **А. Рудчанкі.**

# АПІШАМ ГЕРАІЗМ САВЕЦКАГА НАРОДА

Нядаўна адбылося пасяджэнне студэнцкага навуковага гуртка па гісторыі КПСС. Яго члены заслухалі паведамленне асістэнта кафедры гісторыі КПСС і навуковага камунізму М. Н. Мурашкі аб выніках V-га Усесаюзнага конкурса студэнцкіх работ па грамадскіх навуках.

У сувязі з набліжэннем знамянальнай даты — 30-годдзя з дня перамогі Савецкага Саюза над фашысцкай Германіяй члены нашага гуртка вырашылі распрацаваць цэлы шэраг тэм, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, раскрываючых гераізм савецкага народа ў барацьбе за вызваленне ад фашысцкага іга. Намечана таксама арганізаваць сустрэчы з удзельнікамі вайны, экскурсіі ў краязнаўчы музей, культпаходы на патрыятычныя кінафільмы.

На пасяджэнні гуртка студэнт другога курса гістарычнага аддзялення Аляксандр Айзенштандт зрабіў цікавы даклад пра Мінскае падполле — буйнейшы цэнтр супраціўлення фашысцкім захопнікам у Беларусі. У сваім дакладзе ён выкарыстаў новыя, толькі нядаўна стаўшыя вядомымі факты аб гераічнай барацьбе мінчан.

Такія паведамленні нам вельмі падабаюцца. Мы хочам як мага больш ведаць пра тых, каму абавязаны магчымасцю вучыцца, працаваць, жыць.

**Е. ХАЦЯНОВІЧ,**
**член студэнцкага гуртка па гісторыі КПСС.**

**ІДЗЕ АГЛЯД-КОНКУРС**

# НАДЗЕІ АПРАЎДАЛІ

Першага снежня адбыўся агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці першакурснікаў факультэта фізічнага выхавання. Уступіўшы ў рытм студэнцкага жыцця, імкнучыся падтрымаць добрыя традыцыі свайго факультэта, рабяты з поўнай аддачай таленту давялі да гледачоў усе нумары праграмы.

Добра папрацавалі для стварэння калектыву мастацкай самадзейнасці на курсе сакратар камсамольскай арганізацыі Георгій Хамянок, адказны за культмасавы сектар Уладзімір Ярашук, Іван Ткачык, Аляксандр Лысянкоў і многія іншыя

Першакурснікам, праўда, давялося сустрэцца з істотнымі цяжкасцямі: не было музычных інструментаў. Але самае непрыемнае для самадзейнага артыста, калі даводзіцца выступаць амаль пры пустой зале. Больш чым з чатырох тысяч студэнтаў універсітэта на аглядзе прысутнічалі толькі нямногія. Але іх надзеі былі апраўданы. Канцэрт адбыўся. Ды яшчэ які канцэрт! Уся праграма вялася з выключным пад'ёмам: жарты, гумарэскі, песні, танцы — усё гэта як бы пераплялося ў адзіную лавіну добрага настрою. І яшчэ доўга-доўга пасля канцэрта можна было пачуць цёплыя словы і бачыць радасныя твары.

**М. БУРДАЛЁЎ,**
**адказны на факультэце за інфармацыю ў друк.**

**ПАРАДЫ СТУДЭНТАМ**

# ВУЧЫЦЕСЯ ЧЫТАЦЬ ХУТКА

Каб упарадкаваць паток інфармацыі, выдаюцца рэфераты, часопісы, бюлетэні. Але і на тое, каб з імі азнаёміцца, патрэбен час. Ці можа чалавек чытаць у тры або чатыры разы хутчэй?

Дынамічнае чытанне вядома даўно. Здзіўляльна хутка чыталі Бальзак, Жан-Жак Русо, Пушкін, Чарнышэўскі... Мы ведаем таксама па ўспамінах сучаснікаў, як чытаў Ленін.

Навукова даказана, што чалавек можа чытаць хутчэй, чым звычайна, у 6—7 разоў, і гэта прыносіць толькі карысць — развівае памяць, зробіць больш кампактным успрыняцце інфармацыі. Здольнасць чытаць хутка, «ускач», дынамічна пасля адпаведнай трэніроўкі можа развіць у сабе кожны.

Многія чытачы «субвакалююць», г. зн. пры чытанні варушаць галасавымі звязкамі. Аднак людзі, чытаючы такім чынам, не могуць асіліць больш 150 слоў у мінуту. Дарэчы, гэта самая высокая хуткасць чытання ўслых.

Аказваецца, што на хуткасць чытання накладвае сваю руку «фанетызацыя». З дзяцінства, калі дзіця толькі што пачынае чытаць, яго вучаць спачатку «будаваць» з літараў склады, потым ужо — спалучаць словы ў цэлыя сказы.

Вось тут і выяўляецца своеасаблівасць, неўдасканаленасць нашага арганізма. Хоць магчымасці чалавечага мазга ў сэнсе ўспрыняцця інфармацыі па сутнасці бязмежныя, гэта інфармацыя паступае туды толькі праз органы пачуццяў, адыгрываючых ролю датчыкаў. А іх прапускная здольнасць не так ужо і вялікая. Прычым прапускная здольнасць нашага слыхавага канала ўспрыняцця інфармацыі па крайняй меры ў дзесяць тысяч разоў меншая, чым прапускная здольнасць зрокавага. Вось і атрымоўваецца, што калі чалавек чытае «пра сябе», ён міжволі імкнецца ўзнавіць адпаведны літарнаму і слоўнаму тэксту гуказарад, а значыць, хутчэй чуе, чым бачыць. Адсюль вывад, што прачытваемую інфармацыю ён накіроўвае не па зрокавым, а па слыхавых каналах. Гэтым самым ён штучна стрымлівае хуткасць свайго чытання.

Значыць, той, хто хоча чытаць хутка, павінен, узброіўшыся цярпеннем і воляй, вучыцца «схопліваць» цэлыя фразы, радкі, абзацы тэксту. Для таго, хто шмат чытае, прымусіць сябе чытаць хутка, ахопліваючы позіркам цэлую групу слоў, не так цяжка — дзейнічае прынцып «уведвання». На ім і базуецца сучасная методыка абучэння.

Пытанне аб «хуткачытанні» становіцца больш важным. Само жыццё пабуджае чытаць нас хутчэй. За кожныя дзесяць гадоў паток навуковай інфармацыі павялічваецца ў два разы, але 90 працэнтаў яе паступае да нас праз зрок.

**ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ**

# ДЗЕ РЫХТАВАЦЦА ПРАКТЫКАНТАМ?

**У папярэднім нумары нашай газеты была надрукавана пад такім загалоўкам заметка, у якой група пяцікурснікаў-практыкантаў гісторыка-філалагічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў паведамлялі аб выкарыстанні кабінета педагогікі і псіхалогіі пад аўдыторыю. Па гэтай прычыне не было магчымасці карыстацца наяўнай у кабінеце літаратурай, рыхтавацца да практычных заняткаў.**

**Як паведаміў рэдакцыі начальнік вучэбнай часткі А. К. Каваленка, па крытычнаму сігналу прыняты меры. Улічваючы востры недахоп аўдыторый, у кабінеце педагогікі і псіхалогіі будуць праводзіцца заняткі толькі па гэтай дысцыпліне ў наступны час: у панядзелак і аўторак — з 12 гадзін 25 мін. да 14 гадзін, у чацвер — з 10 гадзін 15 мін. да 14 гадзін, у пятніцу і суботу — з 10 гадзін 15 мін. да 11 гадзін 40 мін.**

**Увесь астатні рабочы час кабінет будзе адкрыты для паслуг студэнтаў.**

**СПОРТ**

# ЗАВАЯВАНЫ ПУЦЁЎКІ Ў ФІНАЛ:

### ВАЛЕЙБАЛІСТАМІ

Як мы паведамлялі ўжо, ў спартыўнай зале ГДУ праходзілі занальныя спаборніцтвы на першынство рэспублікі па валейболу сярод мацнейшых студэнцкіх каманд Беларусі. Пасля перамогі з лікам 3:1 над камандай Віцебскага тэхналагічнага інстытута нашы валейбалісты дабіліся поспеху і ў наступных дзвюх сустрэчах. З такім жа вынікам яны перамаглі студэнтаў Мінскага радыётэхнічнага інстытуа і ўсухую — 3:0 — узялі верх над землякамі, спартсменамі Гомельскага філіяла БПІ.

Разам з нашымі валейбалістамі ў фінале першынства выступіць і каманда РТІ, якая заваявала другое месца ў занальным турніры.

### БАСКЕТБАЛІСТКАМІ

Дружына баскетбалістак ГДУ выступала на занальных спаборніцтвах студэнцкага першынства рэспублікі ў Брэсце. Ва ўпартай барацьбе нашы дзяўчаты занялі другое месца, якое дало права на ўдзел у фінальным турніры.

### КАМАНДАЙ ПА РУЧНОМУ МЯЧУ

У пагранічным горадзе на Бузе адбыліся занальныя спаборніцтвы каманд па ручному мячу. Нашы хлопцы заваявалі другое месца, а з ім — пуцёўку ў фінал.

Азмрочыла жаночая каманда. Яна выступіла ніжэй сваіх магчымасцей і з далейшых спаборніцтваў за чэмпіёнскі тытул выбыла.

### ТЫДЗЕНЬ СПОРТУ

праведзены на гісторыка-філалагічным факультэце. Ён прысвячаўся Ўсесаюзнаму месячніку па здачы норм ГПА. Актыўны ўдзел у ім прынялі многія студэнты. Больш 140 чалавек пабывалі ў турпаходзе па партызанскіх мясцінах, наведалі славутую партызанскую «Крынічку», дзе размяшчаўся штаб народных мсціўцаў.

### ПА ПРАГРАМЕ УНІВЕРСІЯДЫ

Пачаліся спаборніцтвы па праграме круглагадовай VI Універсіяды. Пераможцаў ужо вызначылі плыўцы. Найбольш паспяхова на блакітных дарожках выступілі выхаванцы факультэта фізічнага выхавання. У большасці заплываў яны паказалі лепшыя вынікі і ўпэўнена заваявалі агульнакамандную перамогу.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Камітэт ЛКСМБ і прафком універсітэта, дэканат, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі, студэнты біёлага-глебавага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку трагічнай смерці студэнта 5-га курса ПАЛАВІНКІ Аляксандра Фёдаравіча і яго жонкі, выпускніцы біёлага-глебавага факультэта Тамары Міхайлаўны.**

АЗ 00266 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 7396